## Міжнародная канферэнцыя па гістарычных сядзібах

**4 — 5 верасня 2003 г.** па ініцыятыве Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА адбылася Міжнародная канферэнцыя “Гістарычныя сядзібы Беларусі: стан і будучыня”. У канферэнцыі, якая праводзілася ў былым маёнтку М.К.Агінскага “Залессе” сумесна з Дэпартаментам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры, Беларускім камітэтам Міжнароднай рады па помніках і мясцінах, Дзяржаўным музеем гісторыі тэатральнай і музыкальнай культуры, Нацыянальным агенцтвам па турызму, Смаргонскім райвыканкамам, удзельнічалі 90 прадстаўнікоў дзяржаўных структур, грамадскіх арганізацый, сродкаў масавай інфармацыі Беларусі, а таксама Літвы, Польшчы, Расійскай Федэрацыі, Украіны.

Галоўнымі тэмамі абмеркавання былі стан гістарычных сядзіб Беларусі, падыходы да іх рэабілітацыі, пытанні рэстаўрацыі, формы ўласнасці і карыстання, магчымыя змены ў заканадаўстве. У якасці пілотнага праекта будучай нацыянальнай праграмы рэабілітацыі гістарычных сядзіб разглядаліся прапановы па рэабілітацыі і ўключэнню ў сістэму культурнага турызму былой сядзібы М.К.Агінскага ў Залессі Смаргонскага раёна.

Па выніках абмеркавання прыняты выніковы дакумент, у якім выкладаюцца канкрэтныя прапановы па вырашэнню праблем, што датычацца паляпшэння стану гістарычных сядзіб і выкарыстаннем іх у адукацыйных, выхаваўчых мэтах, а таксама для сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў.

У рамках падрыхтоўкі канферэнцыі быў апублікаваны даведнік “Сядзібы Беларусі”, складзена карта-схема Залесся з турыстычнымі маршрутамі па рэгіёне.